ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1990
ЧАЦВЕР
18
студзеня
№ 2(1631)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАС — ПІК

## У ПАГОНІ ЗА СЕСІЯЙ

Адкуль і калі з'явіліся першыя «хвастысты» ва універсітэце? Дакладна адказаць цяжка. Такая статыстыка афіцыйна не вядзецца. Ды і «хвост» — хітрая рэч. Сёння ён ёсць, а заўтра няма. Падлічы, паспрабуй.

Тым не менш мы вырашылі заняцца гэтай не вельмі прыемнай справай і скласці турнірную табліцу няўдачнікаў. На жаль, яна не поўная, бо не ўсе факультэты згадзіліся выносіць смецце з хаты. Некаторыя ж проста не ўлічваюць «даўжнікоў». Такім чынам, прадстаўляем аматарам статыстыкі толькі шэсць факультэтаў. Бясспрэчны лідэр — біялагічны факультэт. Тут зарэгістравана 56 «недапушчаных» да сесіі. Другое месца з 14 «хвастыстамі» заняў хімфак. Трэцяе прызавое падзялілі між сабой географы і радыёфізікі, у іх па шэсць «непаспяваючых» за сесіяй. А замыкаюць нашу турнірную табліцу студэнты філфака (2) і ФПМ — ніводнага адстаючага.

Безумоўна, шанц застацца ва універсітэце ў кожнага з «хвастыстаў» яшчэ ёсць. Варта «дагнаць» сесію і паспяхова яе завяршыць. Вось толькі стыпендыя ўжо страчана, незалежна ад вынікаў сесіі. Акрамя таго, не ўнушае трывалага даверу якасць схопленых на ляту ведаў, часу для роздуму не багата.

*ПАРАДА «БУ»*

*Ці не мэтазгодней было б прадоўжыць тэрмін здачы сесіі для «хвастыстаў» за кошт канікулаў?*

ВЫ ЧУЛІ?

## Амерыканцы ў Мінску!



Што за дзіва? Няхай сабе 26 чалавек: будучыя філосафы, фізікі, інжынеры, журналісты і два прафесары сярод іх, няхай сабе з розных куткоў Злучаных Штатаў. Мы і не заўважылі, як апошнім часам прызвычаіліся да такіх сустрэч. У мінулым годзе, калі падлічыць, больш за шаснаццаць груп наведалі універсітэт. З Амерыкі, ФРГ, ГДР, Польшчы...

Чаму госці «Спадарожніка» і Камітэта абароны міру найчасцей завітвалі да нас? Сярэднія школы, тэхнікумы, інстытуты ў большасці падобныя між сабой. Іншая справа — універсітэты. У кожным — свая спецыфічная атмасфера. Што ж агульнага ў нас і чым адрозніваемся? Наведваем лекцыі, спрачаемся або згаджаемся з выкладчыкамі, дастаём з кішэні апошні бацькоўскі рубель... Роднасныя душы? Амаль...

Калі аб каверзных пытаннях, то хаця гутарылі зусім па-сяброўску, мы неяк не асмеліліся пацікавіцца, дзе вучаць іх паводзіць сябе так раскавана і ўпэўнена. Затое яны пыталіся, не саромеючыся. Пра калгасы і арэнду, пра культ асобы і тэмпы перабудовы. І так бясконца. Гутарылі без перакладчыка. На іспанскай, французскай, англійскай, нямецкай мовах. І ўзнёслыя воклічы амерыканцаў пры сустрэчы ў адным з класаў з камп'ютэрам «роднай» фірмы, хто не зразумее?

«Добразычлівая і вясёлая гэтая група амерыканцаў»,— гаворыць намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэррабоце Юрый Чабатароў.

Прыйшоў час больш уважліва прыгледзецца да суседзяў. І сустракацца часцей. Бо за першым у гэтым годзе візітам абавязкова будзе другі, трэці...

Амерыканцы ў Мінску? Хіба ж гэта дзіва?



МІЛАСЭРНАСЦЬ

## Дзецям Чарнобыля

Кожная бяда, хвароба ці крызіс грамадства заўсёды найбольш балюча б'юць па дзецях. Раптам мы даведаліся, што нашы дзеці не толькі самыя бесклапотныя і вясёлыя, але яшчэ і безабаронныя і няшчасныя. Дарма, што на працягу дзесяцігоддзяў іх цешылі лозунгам: «Усё лепшае — дзецям!»

Чаго варта гэта пампезная фраза нават супраць адной дзіцячай слязінкі, а іх жа штодня ліюцца рэкі. Нашы дзеці плачуць ад нясцерпнага болю, ад крыўды, ад адзіноты, ад жабрацкага становішча.

Ім патрэбна дапамога: рэальная, матэрыяльная. Дабрачынны дваццацічатырохгадзінны марафон, які зусім нядаўна праводзіла Цэнтральнае тэлебачанне сумесна с Савецкім дзіцячым фондам імя У. І. Леніна, літаральна ўскалыхнуў наша грамадства. І нават лічба ў 61 мільён рублёў, дасланая за час трансляцыі тэлемарафона шматлікімі гледачамі, прадпрыемствамі і грамадскімі арганізацыямі, не адлюстроўвае маштабу дабрыні і спагады, міласэрнасці савецкіх людзей. Грошы працягваюць паступаць на рахунак Дзіцячага фонду.

Не пакінула абыякавым дзіцячае гора і калектыў нашага універсітэта. Па рашэнню рэктарата з фонду матэрыяльнага заахвочвання на рахунак тэлемарафона было пералічана 33 тысячы рублёў.

Супрацоўнікі НДЛ кагерэнтнай оптыкі і НДЛ спектраскапіі паверхні ашчадзілі дзецям па 500 рублёў, а іх калегі з НДЛ фізікі пераўтварэння інфармацыі пералічылі на гэты рахунак 1500 рублёў.

Свае асабістыя ўклады ў дзіцячую скарбонку ўнеслі прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню С. А. Малевіч, студэнт філасофска-эканамічнага факультэта Г. Муравіцкі, а таксама ўсе члены апарата камітэта камсамола універсітэта.

**Акцыя міласэрнасці працягваецца. Грошы на рахунак тэлемарафона можна пералічваць да 10 лютага. Спяшайцеся рабіць дабро! Ваша дапамога зараз неабходна ўсім абяздоленым дзецям нашай краіны і, у прыватнасці, нашым беларускім дзецям, пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

БЮРО ЗНАХОДАК

## Гаспадара!



Шчыра кажучы, не ад добрага жыцця мы адкрываем новую рубрыку. Хутчэй наадварот, бо апошнім часам мы заўважылі, што ва універсітэце ўзрасла колькасць прапаж. Прычым губляецца ўсё: ад маленькай завушніцы да... двухметровых бліскучых шыб.

Вырашылі мы стварыць пры рэдакцыі «Бюро знаходак», дапамагчы універсітэцкай бядзе. І вось удача! На першы раз нават ісці далёка не давялося. Літаральна за некалькі дзесяткаў крокаў ад будынка рэдакцыі «Беларускага універсітэта» знайшлі добры штабель выдатнага шкла. Прытулілася яно сіратліва да абшарпанай сцяны і спалохана пазірае на прахожых. Рознае бывае тут, ва універсітэцкім дворыку, асабліва ноччу. Таго і глядзі, не ўтрымаецца хто ад спакусы падцэліць цаглінай у далікатныя шыбіны. А мо і ў гаспадарцы каму спатрэбіцца, усё ж лепш, чым на двары мокнуць. Магчыма, і універсітэцкім гаспадарнікам варта на ўсялякі выпадак пацікавіцца, ШТО гэта за шкло, пакуль яно яшчэ цэлае.

М. ДЫЛЕКТАР,
служачы «Бюро знаходак».

## ШАПКАМІ ЗАКІДАЮЦЬ?

ДРОБЯЗІ ЖЫЦЦЯ

Самы люты вораг універсітэцкіх гардэробшчыкаў — футравыя студэнцкія шапкі. І чым большая каштоўнасць у вашай вушанкі, тым зласней шчэрацца ад іх выгляду непрыступныя бабулькі. І ніякія ўгаворы, ні нават пагрозы паскардзіцца каменданту будынка, на пільных вартаўніц не дзейнічаюць.

Футравыя шапкі даўно ў апале. Зараз яны замест свайго законнага месца ў гардэробе вымушаны туліцца ў цесных студэнцкіх торбачках ці проста на пыльным падаконніку. «Шапкі не прымаем!» — такі кароткі прысуд вісіць ва ўсіх гардэробах універсітэта.

— Ну, гэта ўжо занадта,— абурыўся начальнік гаспадарчага аддзела Уладзімір Карпавіч Казлоў.— Шапкі здаваць у гардэроб можна, толькі ў поліэтыленавых мяшочках. Так больш надзейна.

Непакой У. К. Казлова, магчыма, небеспадстаўны. Барані бог, прападзе ў каго са студэнтаў футравая шапка. Гардэробшчыку ж на яе трэба паўгода працаваць. Праўда, у выкладчыкаў шапкі не горшыя, чым у студэнтаў, а іх у гардэробе прымаюць ахвотна. І, здаецца (каб не наклікаць бяду!), пакуль усё ціха. Выкладчыцкія шапкі цэлыя і непашкоджаныя.

— Маштабы не тыя,— парыруе Уладзімір Карпавіч. — Студэнты перад пачаткам заняткаў стрымгалоў ляцяць. Толькі паспявай нумаркі выдаваць. У такой мітусні і зблытаць шапкі няцяжка, і згубіць. А адказваць жа гардэробшчыку. Зрэшты, іх у нас і так не хапае...

ДАРЭЧЫ

Боязь, што студэнты закідаюць шапкамі гардэробшчыкаў, не толькі псуе эстэтычны выгляд нашых (і без таго не вельмі прывабных) аўдыторый, аднак дае шанц «дробненькім» злачынцам на ўдачлівае паляванне. Студэнты — народ непаседлівы, пад час сесіі — разгублены. Не кожны будзе сядзець усе перапынкі і вартаваць сваю шапку. Ды і не браць жа з сабой вушанку, прабачце... Разумныя людзі даўно прыдумалі гардэроб, мы ж чамусьці ігнаруем гэтае вынаходніцтва цывілізацыі. А прэтэндуем жа на флагман навукі, і, у пэўнай ступені, культуры.



*Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Мікалай МАСТОЎСКІ, Сяргей ГРЫЦ (фота).*

ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ

# НА СКРЫЖАВАННІ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН

*Савецка-польскія адносіны маюць доўгую і складаную гісторыю. Але сярод іншых падзей у гісторыі дзвюх краін выдзяляюцца адносіны паміж СССР і Польшчай у гады другой сусветнай вайны. Тут нямала «белых плям», якія яшчэ чакаюць свайго даследчыка. Працэсы перабудовы ў СССР і аднаўлення ў Польскай Рэспубліцы паставілі перад гісторыкамі задачу — даследаваць мінулае ўзаемаадносін ва ўсёй сукупнасці фактаў — і адмоўных, і станоўчых, аднавіць гістарычную праўду.*

*Аб адным са складаных перыядаў у гісторыі савецка-польскіх адносін і пойдзе размова.*

Пасля вываду з СССР у жніўні 1942 года польскай арміі Андэрса адносіны паміж савецкім урадам і ўрадам Польскай рэспублікі ў Лондане значна ўскладніліся. Да пачатку 1943 года спынілася сумеснае супрацоўніцтва ў галіне аказання дапамогі палякам, што пражываюць у СССР, фактычна было анулявана ваеннае пагадненне паміж урадамі ад 14 жніўня 1941 года, не прадпрымалася сумесных знешнепалітычных акцый.

Становішча ўскладнілася тым, што на працягу ўсяго перыяду супрацоўніцтва савецкага і польскага эмігранцкага ўраду ў гады другой сусветнай вайны так і не было вырашана жыццёва важнае для абодвух бакоў пытанне. Размова ідзе пра савецка-польскую граніцу. Савецкі ўрад абгрунтавана настойваў на аднаўленні тых граніц, якія парушыла гітлераўская Германія ў 1941 годзе. У адносінах Польшчы І. В. Сталін у снежні 1941 года ў ходзе візіту прэм'ер-міністра Польскай рэспублікі генерала У. Сікорскага заявіў, што яна павінна атрымаць значныя тэрытарыяльныя прырашчэнні на захадзе, стаць дружалюбнай Савецкаму Саюзу краінай. Пазіцыя польскага эмігранцкага ўрада заставалася нязменнай на працягу ўсёй другой сусветнай вайны: «Што датычыць Польшчы, — пісала «Мысль польска» (адзін з неафіцыйных органаў польскага ўрада ў Лондане,— аўтар),— то адзіная граніца, якую яна прызнае,— гэта граніца Рыжскага дагавору».

У пачатку 1943 года пытанне аб граніцах вылучаецца на першы план у савецка-польскіх адносінах. І справа тут не толькі ў тым, што гэта праблема рэльефна паўстала пасля замарожвання савецка-польскага супрацоўніцтва ў ваеннай і іншай абласцях. Гэта было выклікана і зменамі ваенна-палітычнай абстаноўкі на савецка-германскім фронце. Перамога ў Сталінградскай бітве, паспяховая зімовая кампанія 1943 года паказалі, што Чырвоная Армія ў хуткім часе выйдзе на граніцу СССР і што менавіта яна будзе вызваляць Польшчу. Лонданскія палітыкі разумелі, што ім у такім выпадку будзе цяжка ўсталяваць у Польшчы свой рэжым. Для гэтага былі ўсе падставы. У пачатку 1943 года савецкае кіраўніцтва робіць крокі, накіраваныя на кансалідацыю і арганізацыйнае афармленне польскіх груп у СССР, якія знаходзіліся ў апазіцыі да «лонданскіх палякаў». У студзені 1943 года група польскіх дзеячаў, аб'яднаных вакол часопіса «Нове виднокреги», у пісьме на імя В. М. Молатава прапанавала стварыць Саюз польскіх патрыётаў (СПП) у СССР і пачала весці практычную работу ў гэтым напрамку.

У гэтай сітуацыі частка польскіх эмігрантаў у Англіі і ЗША, прыхільнікі тэорыі «Вялікай Польшчы», настойліва выступаюць з патрабаваннем заходніх абласцей Украіны, Беларусі і Літвы, робячы стаўку на рознагалоссі ў лагеры антыфашысцкай кааліцыі і разлічваючы на падтрымку Чэрчыля і Рузвельта.

Другая, больш умераная частка польскай эміграцыі, да якой належаў і прэм'ер-міністр У. Сікорскі, спрабавала, не змяняючы пазіцый у адносінах да граніц, нейкім чынам урэгуляваць адносіны з Савецкім Саюзам і такім шляхам забяспечыць ранейшы статус-кво ў Польшчы. 9 лютага 1943 года У. Сікорскі накіроўвае І. В. Сталіну пасланне, у якім выказвае хваляванне наконт пагаршэння ўзаемаадносін паміж польскім эмігранцкім урадам і ўрадам СССР. У пасланні ён указваў, што «тыя выключныя пакуты, якія перанесла мая краіна, а таксама сродкі, якімі яна навучылася перадольваць іх, даюць маёй краіне права на тое, каб яе інтарэсы і яе запыты былі асабліва прыймальны да ўвагі ў перыяд, калі вызваленчая вайна ўступае ў рашаючую фазу». У. Сікорскі выказаў гатоўнасць абмеркаваць праблемы, звязаныя з двухбаковымі адносінамі, і прасіў І. Сталіна прыняць пасла Т. Ромера, які вярнуўся з Лондана ў Маскву з новымі інструкцыямі. Як жа адрэагаваў на гэту прапанову Савецкі ўрад?

У І. Сталіна да гэтага часу, відаць, ужо склалася свая канцэпцыя ў адносінах да ўрада будучай Польшчы. У сярэдзіне лютага група польскіх дзеячаў у СССР на чале з вядомай пісьменніцай В. Васілеўскай была прынята ў Крамлі. Вынікам гэтай сустрэчы з'явілася стварэнне арганізацыйнага камітэта СПП. 19 лютага ў газеце «Радзяньска Украіна», а потым у «Правде» з'яўляецца артыкул вядомага савецкага пісьменніка А. Карнейчука (хутка ён быў назначаны намеснікам наркома замежных спраў). У ім гаварылася: «У адзін цяжкі дзень барацьбы, калі ўкраінскі народ напружвае ўсе сілы, калі гінуць яго лепшыя сыны і дочкі ў барацьбе з фашысцкім катам Украіны і Польшчы,— там, у цішы ўтульных кабінетаў Лондана, польскія «палітыкі» — паны-шляхцічы, нібы чорныя вораны, паглядаюць на акрываўленую зямлю Украіны і думаюць адарваць заходнія яе вобласці, зноў здзеквацца над украінскім народам». У артыкуле А. Карнейчука ўпершыню ў афіцыйным выданні Савецкага ўрада быў дадзены адпор прэтэнзіям на заходнія вобласці Украіны і Беларусі.

Далей падзеі развіваліся з калейдаскапічнай хуткасцю. 25 лютага ўрад У. Сікорскага абмеркаваў польска-савецкія адносіны і выступіў з заявай. У заяве ўказвалася, што «Польшча пастаянна праяўляла гатоўнасць да супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам у вядзенні вайны і ў захаванні сяброўскіх і добрасуседскіх адносін пасля перамогі. Зусім недарэчна падазраваць Польшчу ў намерах пабудаваць усходнія граніцы Польскай рэспублікі на Дняпры ці Чорным моры або прыпісваць Польшчы нейкія тэндэнцыі да распаўсюджвання граніц далей на Усход». Тым не менш у заяве падкрэслівалася, што польскі ўрад «нязменна прытрымліваўся з моманту заключэння польска-савецкага дагавору ад 30 ліпеня 1941 года той пазіцыі, што ў пытанні аб граніцах паміж Польшчай і Савецкай Расіяй захоўваецца статус-кво, існаваўшы да 1 верасня 1939 года, і лічыць, што падрыў гэтай пазіцыі, якая адпавядае Атлантычнай хартыі, шкодзіць адзінству Аб'яднаных Нацый».

На наступны дзень, 26 лютага, І. В. Сталін прыняў польскага пасла ў СССР Т. Ромера. На сустрэчы прысутнічаў і В. М. Молатаў. Польскі бок быў схільны абмеркаваць пытанні, звязаныя з дадатковым наборам у польскую армію на тэрыторыі СССР, пытанні грамадзянства, эвакуацыі поль№скіх дзяцей з СССР, стварэнне сістэмы арганізацый польскага пасольства на месцах. Савецкае кіраўніцтва ў якасці праблем вылучала наступныя: аб прапагандзе, аб грамадзянстве, аб граніцах. Узаемаразуменне дасягнута не было ў асноўным пытанні — аб граніцах, і сустрэча ў цэлым закончылася безвынікова. Яна не магла спыніць прагрэсіруючы крызіс двухбаковых адносін.

2 сакавіка была надрукавана заява ТАСС, якая стала адказам на заяву польскага ўраду ад 25 лютага. У ёй гаварылася, што «савецкія кіруючыя колы лічаць, што адмаўленне права за ўкраінскім і беларускім народамі на ўз'яднанне са сваімі адзінакроўнымі братамі сведчыць аб наяўнасці імперыялістычных тэндэнцый, а спасылкі польскага ўрада на Атлантычную хартыю не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Атлантычная хартыя не дае нікому права рабіць замах на нацыянальныя правы ўкраінцаў і беларусаў, а наадварот, яна зыходзіць з прынцыпаў прызнання нацыянальных правоў народаў, у тым ліку ўкраінскага і беларускага». Далей гаварылася, што нават брытанскі міністр лорд Керзон у свой час разумеў беспадстаўнасць замахаў Польшчы на землі ўкраінцаў і беларусаў, а «польскія кіруючыя колы да гэтага часу не хочуць разумець гэтага пытання... Такая пазіцыя польскіх кіруючых колаў аслабляе перш за ўсё саму Польшчу і ломіць адзіны фронт славянскіх народаў у барацьбе з германскім нашэсцем». Пазіцыя савецкага кіраўніцтва была безагаворачна падтрымана Саюзам польскіх патрыётаў.

*(Працяг у наступным нумары).*

А. РУСАКОВІЧ.

ЗАЛІКОЎКА







*На экзамен трэба ісці ўзброеным. Гэта ведаюць усе, але кожны разумее па-свойму. І ад узброенасці студэнта залежыць ад яго працаздольнасці — у каго ведамі, здабытымі пад час заняткаў, у каго «гармонікамі» і стужкамі шпаргалак, над якімі таксама трэба папрацаваць, а самы адчайны і лянівы запхне за пояс падручнік, махнуўшы на ўсё рукою. Пасля паядынку раззбраенне таксама living рознае — веды застаюцца, а тое, што трымалася на «шпорах», знікае разам з імі.*

*У самастойным жыцці наўрад ці давядзецца выцягнуць цішком выратавальны «гармонік». Так што выбірай, студэнт.*



ПАЧЫТАЕМ?

## «Кабзар» сябруе з «Гусляром»

Прыгожыя альбомы Сярэдняй Азіі і строгія томікі з Прыбалтыкі, рамантычныя творы малдаўскіх пісьменнікаў і гумарыстычныя выданні грузінскіх аўтараў... Усё гэта можна знайсці на паліцах магазіна «Кнігі народаў СССР», які знаходзіцца па адрасу: Ленінскі праспект, 131, кор. 1.

— Больш чым на 120 тысяч рублёў у год прадаём мы кніг, выдадзеных у саюзных рэспубліках. І цікавасць да іх пастаянна расце,— расказвае загадчыца магазіна Антаніна Андрэеўна Трафімовіч.— Зараз рыхтуемся да ўдзелу ў «Тыдні ўкраінскай кнігі ў БССР», які пройдзе з 23 да 30 студзеня. На выстаўцы-продажы, арганізаваным у нашым магазіне, сярод твораў мастацкай літаратуры — адна з самых знакамітых і чытаемых кніг у свеце, кніга драматычнага і вялікага лёсу — «Кабзар» Тараса Шаўчэнкі, а таксама цудоўнае мініяцюрнае выданне паэтычнага зборніка «Перадсвітальныя агні» Лесі Украінкі.

Пра жыццё і творчасць Тараса Шаўчэнкі пасля ссылкі, пра яго дружбу з М. Чарнышэўскім расказвае кніга Аляксандра Ільчанкі «Пецярбургская восень».

Далёка не кожнаму вядома, што легендарны герой грамадзянскай вайны, камандзір Чырвонага казацтва Віталь Прымакоў быў таленавітым пісьменнікам. У кнізе «І ўзыходзілі макі чырвоныя...» сабраны яго нарысы, артыкулы, вершы і расказы.

У магазіне можна зрабіць папярэдні заказ на патрэбныя выданні, пазнаёміўшыся з планамі выпуску літаратуры ўкраінскіх выдавецтваў «Политиздат Украины», «Радзяньский письменник», «Техніка» (навукова-тэхнічная і вытворчая літаратура), «Вища школа» (вучэбна-метадычная і даведачная літаратура для студэнтаў), «Будівельник» (кнігі для будаўнікоў), «Урожай».

А ўрачыстае адкрыццё Тыдня ўкраінскай кнігі ў БССР адбудзецца 23 студзеня ў Доме кнігі (пр. Машэрава, 11). Тут будзе разгорнута выстаўка кніг, прывезеная нам з Украіны, якая дасць магчымасць беларускім чытачам бліжэй пазнаёміцца з літаратурай брацкіх рэспублік.

С. ДАШЧЫНСКАЯ,
рэдактар аддзела прапаганды і рэкламы кнігі Рэспубліканскага аб'яднання «Белкніга».



# Партрэт крылатай Ніке

***Чаму мастак піша партрэт? Ці таму, што чалавек зацікавіў яго? Ці таму, каб людзі, сённяшнія і будучыя, змаглі ўбачыць гэтага чалавека?..***

Як гэта дзіўна атрымалася: нядаўна ўспомніў пра Ніку Турбіну, якой было ўсяго восем гадоў, калі пра яе пісалі газеты, расказвала тэлебачанне. У 1984 годзе выйшла першая яе кніга «Черновик».
—Што ж здарылася з «крылатай Нікай»? — падумаў я. І нечакана Ніка прыехала ў Мінск. Усяго два канцэрты. І тыя не далі аншлагу. Задумайцеся: яе слухаў шматтысячны Калізей і — няпоўная зала Белдзяржфілармоніі.

Во вторсырье
Сдают журналы,
Газеты, книги и стихи.
Вот хламом стал
Некрасов, Пушкин,
А дальше —
И того уж гуще
Несут старательные руки
Тугие, плотные тюки.
И — на бумагу туалетную
Готовы выменять
Заветную
Строку,
Которой бредил мир,—
У каждого ведь свой
Кумир.

17 снежня ёй споўнілася пятнаццаць. Вершы пачала пісаць вельмі рана. «Мне было чатыры гады. Была ноч. Я прачнулася і нешта гаварыла. Як аказалася, мой першы верш, які і запісала мама:

Алая луна,
Загляни ко мне
В темное окно.
В комнате черно:
Чёрные углы,
Чёрные дома.
Чёрная сама.

Яе «Черновик» выдадзены ў адзінаццаці краінах свету: Амерыцы, Англіі, Італіі, Японіі і іншых. Ёй, як і Ганне Ахматавай, у Венецыі ўручаны Вялікі Залаты Леў.

Былі людзі, якія не верылі, што гэта маленькая дзяўчынка сама піша вершы, і тады яна адказвала, што іх піша яе сабака.

«Я пішу вершы, але не прыдумваю... Балюча. Толькі адны гавораць пра гэта ўслых, а я — вершамі».

Яна не падобная на тую дзяўчынку з газетных старонак — вырасла. У свае пятнаццаць гадоў Ніка пакідае, без перабольшання, уражанне тонка адчувальнага інтэлекту. Бясспрэчна, юная Турбіна — ужо асоба.

Калі яна чытае свае вершы, калі гаворыць, здаецца, што пакутуе, што ёй балюча. Напэўна, у такія моманты нервы ўжо на мяжы. Думаю, што Ніка спадзяецца, што людзі стануць больш добрымі і знойдуць свайго Бога. Сама Ніка Верыць. «Мне здаецца, калі чалавек без веры, то ён не можа існаваць — у яго няма душы. Напэўна, зараз вельмі многа бяздушных, таму што ў свеце многа злосці. Мы пазбаўлены веры. Калі мы не верым адзін у аднаго — гэта ўжо страшна. У нас няма нічога святога, дзеля чаго б мы жылі. Так, дзеля сваіх дзяцей. Але дзеля чаго будуць жыць нашы дзеці?.. У чалавека павінен быць свой дух. Свой дух — гэта жывучая думка на карысць іншага чалавека. Я проста хачу, каб людзі пастараліся паверыць адзін аднаму. Я спадзяюся, што мы зразумеем адзін аднаго, інакш мы не зможам жыць».

Ёй падабаецца ранні Маякоўскі, Мандэльштам, Хлебнікаў, Пастэрнак. Любіць «Науцілус Пампіліус» і «Скорпіонз».

— **Якая ты, Ніка Турбіна, у жыцці?**

— Вы ведаеце, Ніка Турбіна ў жыцці нядрэнная дзяўчынка. Любіць кнігі, дыскатэкі, марожанае, падарожнічаць і многае-многае...

Выходзіць чытаць вершы, нібы на Галгофу,— напружаная і скаваная, здаецца, там, у мікрафона, згарае. І таму, падалося, не вельмі любіць ісці да мікрафона. А калі адказвае на пытанні — і ўдала іранізуе, і здзіўляецца, і... але ўсё роўна згарае.

— **Што табе больш па душы: неба ці зямля?**

— Неба.

— **Вытокі тваёй радасці-смутку?**

— У людзях.

— **Дзеля чаго жыць?**

— Дзеля кахання.

Ніка трымае ў руцэ сваю кнігу, выдадзеную ў Амерыцы. Тыраж савецкага выдання (50000) аказаўся настолькі малым, што ў яе нават няма гэтай кнігі. Хаця Дзіцячы фонд плануе выпусціць Нікіна «Избранное». Але...

— **Ніка, ты шмат ездзіш па свеце, выступаеш...**

— Гэта патрэба. Калі ў мяне нешта атрымліваецца, няхай людзі ведаюць.

— **І ўражанні ад паездак?**

— Я ніколі не чакала такога прыёму!.. Калі гаварыць аб Італіі, яна — краіна Сонца. І там такія ж сонечныя людзі, такія ж светлыя. Я, калі ад'язджала, плакала. І яны плакалі. Мы так падобны!

— **Ты сустракалася з Іосіфам Бродскім...**

— Калі я ішла на сустрэчу, то вельмі хвалявалася. А потым убачыла вочы гэтага чалавека: блакітныя! Не, шэрыя. І такія шчырыя! І ад душы зацікаўленыя... Я лічу яго цудоўным, вялікім паэтам. Але, акрамя таго, я ўбачыла, які ён цудоўны чалавек. Які натхнёны.

— **Ніка, што для цябе Расія?**

— Расія — гэта мой дух, дух геніяльнага народа, які быў зломлены. Я спадзяюся, я веру, што рускі дух, што Русь будзе жыць.

— **«Я не хачу так хутка жыць!» — твой радок. Ці атрымліваецца не спяшацца?**

— Ведаеце, даводзіцца спяшацца: усе бягуць. На жаль, і я не магу спыніцца. Жыццё — гэта бег. І патрэбна паспець нешта зрабіць, хаця б паспрабаваць.

Ніку запрашаюць у Бастонскі коледж на паўгадавое навучанне па спецыяльна распрацаванай праграме з улікам яе інтарэсаў — мова і гісторыя мастацтваў ЗША і амерыканскага тэатра. Справа ў тым, што Ніка думае паступаць ва Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі на акцёрскае аддзяленне. І на пытанне: «А чаму не ў Літінстытут?» выпаліла: «Я хачу іграць, а не вучыцца пісаць вершы». Акрамя таго, на экраны ўжо выйшла карціна з яе ўдзелам — «Гэта было ля мора».

«Каб разумець, не патрэбна вывучаць англійскую, французскую ці іншую мову, не патрэбна эсперанта,— вы без мовы зразумееце адзін аднаго»,— гэта Нікіна думка.

Немагчыма перадаць на паперы той гіпнатычны стан, які зыходзіць ад Нікі. Здаецца, зала зачаравана і — запалонена. Усе сказаныя мною словы, бясспрэчна, не перададуць і паловы ўсёй істоты Нікі. Але гэта — мой партрэт паэта. Магчыма, ён дапаможа вам знайсці для сябе Ніку.

Сяргей ШАПРАН.



# ПРЭМІІ НЕ ПРЫСУДЖАЦЬ!?

***Год 1990 ЮНЕСКА аб'явіла годам Францыска Скарыны. Наколькі вядома, помнік пачынальніку ўсходнеславянскага кнігадрукавання, выдатнаму беларускаму асветніку і гуманісту павінен быць устаноўлены перад прэзідыумам АН БССР. Кажуць, вынікі першага тура конкурсу на лепшы праект несуцяшальныя: першую прэмію не прысуджалі...***

А. ГУСАКОЎ,
студэнт.

У адказе на гэтае пытанне нам дапамагаюць калегі са шматтыражнай газеты «За передовую науку». Вось што адзначыў у інтэрв'ю член журы, доктар філалагічных навук А. В. МАЛЬДЗІС:

— Так, праекта, які задаволіў бы ўсіх, сапраўды, не было. Размясціць помнік перад магутнымі акадэмічнымі калонамі — справа нялёгкая. Яны патрабуюць або «звышманументальнага» вырашэння, або цалкавітага падпарадкавання. І тое, і другое непрымальна, бо помнік павінен «жыць» самастойным мастацкім жыццём. А наблізіцца да гэтага ўдалося лічаным скульптарам (усяго былі прадстаўлены 22 праекты). Таму перспектыўнымі мне ўяўляюцца тыя праекты, якія арыентаваны на іншае месца — на фоне Цэнтральнай навуковай бібліятэкі АН БССР (металічную агароджу можна было б зняць). Тут ёсць прастора, ёсць магчымасць стварыць ансамбль, прысвечаны выдатным беларускім пісьменнікам са Скарынам у цэнтры. Прынамсі, падставу для такога помніка дае задума П. Лука, адзначаная трэцяй прэміяй (але ж Скарына ў гэтага скульптара атрымаўся агрубелым, неадухоўленым).

Найбольш мне спадабаўся вынік працы творчай групы ў складзе А. Арцімовіча, В. Бялянкіна, М. Рыбнікава і Г. Новіка (другая прэмія).

Першы этап конкурсу ўсё ж даў свой плён. Чатыры прадстаўленыя работы былі рэкамендаваны для другога тура.



# ПАДКРЭСЛІМ

Нагадваем: пачыналі мы ў нумары 28 за мінулы год.

У нас кожная літара мае толькі адно напісанне. Сярод нас няма выбраных знакаў — прапісных. А каб адзначыць імёны ўласныя, іх падкрэсліваюць:



Ким Клим Дели

Добра вядомыя імёны пішам скарочана:



Маркс Энгельс Ленин Пушкин Толстой Есенин

Доўгая рыска патрабуе разгорнутага чытання:



У многіх тэкстах імёны Маркса і Энгельса сустракаюцца разам. Так і пішам:



Законы эканоміі ў стэнаграфіі шануюцца, таму і вырашылі мы, што на два прозвішчы хопіць аднаго падкрэслівання.

Практыкаванне для чытання (паўтор мінулых урокаў):



Урок вёў
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.



# Чатыры стагоддзі назад

## (са Статута для студэнтаў)



«Ужыванне віна ці піва не толькі ў ранішнія гадзіны не рэкамендуецца, а катэгарычна забаронена». Так адназначна выказваўся па пытанню, якое горача абмяркоўваецца сёння, нехта Сімон Гроненберг, аўтар Статута для студэнтаў, выдадзенага ў 1588 годзе.

Гэты унікальны дакумент знойдзены ў архіве Лейпцыгскага універсітэта імя Карла Маркса. У ім утрымліваецца шмат іншых цікавых прадпісанняў, якія дапамагаюць уявіць, як жылі і вучыліся студэнты чатыры стагоддзі назад.

«Вучыцца неабходна ў спецыяльных памяшканнях, а не на прыродзе, таму што гэта адцягвае ўвагу ад заняткаў. Навучальныя ўстановы павінны быць прасторнымі і добра праветрывацца, павернутымі на ўсход ці на поўдзень... З раніцы да абеда ні ў якім выпадку не галадаць, а прымаць лёгкі сняданак з аднаго зваранага ўсмятку яйка, спелай садавіны, масла, хлеба і сыра. У час абеду ўдосталь есці мяса, рыбу і свежыя яйкі. Прычым, у гэты час студэнт не павінен быць на сонцы ці спаць».

Статут рэкамендуе таксама студэнтам пазбягаць меланхоліі, апранацца, як сказалі б сёння, сціпла, але з густам — у ліку абавязковых аксесуараў адзення называецца гальштук.

# СТУДЫЁН

РЭКЛАМА

## Трыбуны чакаюць

Сустракаць гасцей заўсёды прыемна. Асабліва, калі яны добрыя знаёмыя. Гасцінны гаспадар абавязкова стараецца, каб гасцям спадабалася і ўсё было на вышэйшым узроўні. У тым, што нашы спартсмены — гасцінныя і ветлівыя гаспадары, валейбалісты з Вільнюса, Рыгі і Тарту мелі магчымасць пераканацца: іх сяброўскім сувязям не адзін год.

А якія ж мы з вамі? Аб гэтым скажуць трыбуны для балельшчыкаў. Вельмі хочацца, каб у час традыцыйных спаборніцтваў па валейболу паміж камандамі БДУ і Прыбалтыкі яны былі поўнымі. Чакаем вас у спартыўным комплексе універсітэта. Пачнуцца гульні 29 студзеня і закончацца 31. Пачатак а 12-й гадзіне.



ВІР ЛЯ ВАРОТ. Фота С. ГРЫЦА.

ЗАПРАШАЕМ НА АЛІМП

## Жадаеце стаць барцом?

Аляксандр Мядзведзь... Каму не знаёма гэта імя! У свой час яно гучала з экранаў тэлевізараў, не знікала са старонак газет. Мы ганарыліся рэкордамі славутага спартсмена, здзіўляліся яго сіле, вытрымцы, мужнасці. А. Мядзведзь — самы тытулаваны атлет у гісторыі барацьбы, трохкратны чэмпіён Алімпійскіх гульняў. Прычым, ён падымаўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару тры разы запар. У 1964 годзе яму апладыравалі ў Токіа, у 1968 Аляксандру таксама не было роўных на барцоўскай арэне, у 1972 — на Алімпіядзе ў Мюнхене зноў у гонар нашага барца гучыць гімн Савецкага Саюза.

— Яго рэкорды і сёння застаюцца рэкордамі А. Мядзведзя,— гаворыць экс-чэмпіён СССР, заслужаны трэнер БССР Уладзімір Мікалаевіч Лятун.— Напэўна, шмат гадоў назад, калі Аляксандр упершыню выйшаў на арэну і правёў першую атаку, ён наўрад ці думаў, што калі-небудзь побач з яго прозвішчам будзе стаяць столькі тытулаў. Магчыма, некага з нашых студэнтаў таксама чакаюць званні і ўзнагароды, хоць яны гэтага пакуль і не падазраюць.

Таму і вырашыў Уладзімір Мікалаевіч з наступнага семестра пасля доўгага перапынку аднавіць работу секцыі вольнай барацьбы: у новым спартыўным комплексе абсталявана барцоўская зала. Акрамя таго, студэнты, якія пачнуць заняткі ў секцыі, будуць забяспечаны неабходнай формай. І хто ведае, магчыма на наступнай Алімпіядзе мы пачуем знаёмыя прозвішчы.

### РАДОК З АРХІВА

Гісторыя данесла да нашага часу скупыя радкі, якія пацвярджаюць, што яшчэ з 708 года да нашай эры барацьба з'яўлялася фінальнай часткай Алімпійскіх гульняў у Старажытнай Грэцыі. Вольная барацьба стала алімпійскім відам у 1904 годзе на III Алімпіядзе ў амерыканскім горадзе Сент-Луісе. А ў 1921 годзе была створана Міжнародная аматарская федэрацыя барацьбы (ФІЛА), членамі якой барцы Савецкага Саюза сталі толькі ў 1947 г. У нашай краіне гэты від спорту атрымаў развіццё ў 1945 годзе. Тады ў Ленінградзе адбыўся першы чэмпіянат СССР па вольнай барацьбе.

Выкарыстанне пры падрыхтоўцы барцоў вольнага стылю шматгадовага вопыту спецыялістаў па класічнай барацьбе, разнастайных элементаў тэхнікі і тактыкі, якімі багатыя многія віды нацыянальнай барацьбы, садзейнічала хуткаму развіццю вольнай барацьбы.

У 1951 годзе савецкія спартсмены ўпершыню выйшлі на міжнародную арэну. У спісах чэмпіёнаў Алімпіяд свету і Еўропы з'явіліся прозвішчы Р. Дзмітрыева, Б. Гурэвіча, Л. Тадыашвілі, І. Ярыгіна, А. Іваніцкага, С. Андыева, братоў Сяргея і Анатоля Белаглазавых і многіх іншых.

Савецкая школа вольнай барацьбы з'яўляецца вядучай у свеце. Звыш трох дзесяткаў гадоў нашы барцы вольнага стылю займаюць перадавыя пазіцыі на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы. Такі высокі поспех тлумачыцца творчым падыходам спецыялістаў да вучэбна-трэніровачнай работы. Так што пакуль ёсць магчымасць запісацца ў секцыю вольнай барацьбы, спяшайцеся. Вас чакаюць алімпійскія вышыні.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Доўгі шлях да фіналу

У гэтым навучальным годзе сістэма правядзення першынства ВНУ БССР па валейболу аказалася вельмі складанай. Мяркуйце самі. Заяўкі на ўдзел у гульнях падалі 24 каманды. На першым этапе ўсе былі разбіты на шэсць чацвёрак. Па выніках першага тура засталося дванаццаць каманд, якія таксама склалі тры чацвёркі. Пасля кожнага этапа толькі дзве лепшыя каманды працягвалі шлях да фіналу.

Каманда дзяўчат нашага універсітэта першы тур праводзіла ў Брэсце, дзе выйграла ў спартсменак Гомельскага кааператыўнага інстытута і ў Магілёўскага тэхналагічнага. Быў і пройгрыш — Брэсцкаму педагагічнаму інстытуту з лікам 1:3. На гэтым барацьба іх не скончылася. Яна працягвалася ў другім крузе, у ліку дванаццаці.

Другі этап праходзіў у Брэсце. І спартсменкі нашага універсітэта і Брэсцкага педінстытута, якія ўжо сустрэліся, як старыя знаёмыя, разумелі, што толькі пераможца гэтай сустрэчы трапляў у фінальную шасцёрку.

Гульня была вельмі напружанай. Чатыры партыі нікому не далі перавагі. Лік 2:2. У пятай, рашаючай, партыі лік мяняецца то ў адзін, то ў другі бок. У канцы гульні з вынікам 14:14 нашы дзяўчаты правялі дзве рэзультатыўныя атакі—16:14. Паядынак, а разам з ім і сустрэчу выйгралі валейбалісткі Белдзяржуніверсітэта.

Найбольш удала ў гэтых спаборніцтвах згуляла студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Анжэла Зарэцкая. Ёй добра дапамагала на лініі трэцякурсніца ФПМ Анжэла Варабей. Ды і астатнія дзяўчаты таксама заслугоўваюць пахвалы.

Здавалася б, першынство ВНУ закончана і можна адпачыць. Але гэта не так. Дзяўчатам няма калі расслабляцца — трэба падтрымліваць форму: у красавіку каманды ІФК, педагагічнага інстытута, наргаса і нашага універсітэта, а таксама Гродзенскага універсітэта і Гродзенскага медыцынскага інстытута будуць аспрэчваць права называцца лепшай вузаўскай камандай рэспублікі.

Удачы ім!

М. КУЧЫНСКІ,
старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Рубрыку «Студыён» вядзе Зінаіда Аляшкевіч.

З КНІГІ ГІНЕСА

## РЭКОРДЫ... РЭКОРДЫ...

ГІ РОССІ, саракагадовы эльзасец з горада Кольмар, усталяваў новы рэкорд у спаборніцтвах па трыятлону. Атлет затраціў нямала намаганняў, каб праплыць 20 км, пераадолець на веласіпедзе адлегласць даўжынёю 900 км і прабегчы дыстанцыю ў 211 км. Гі Россі фінішыраваў праз 111 гадзін.

З ДАПАМОГАЙ рухавіка, які ўмяшчаецца ў школьным ранцы і прыводзіць у рух драўляны прапелер, Томасу і Міхаэлю Тропманам давялося развіць хуткасць да 75 км у гадзіну. Браты-падарожнікі, абодва з Вайдхаўзэна (ФРГ), могуць рухацца, выкарыстоўваючы сваё вынаходніцтва на ролікавых каньках, веласіпедзе, звычайных каньках, лыжах і санках. Рухавіком з'яўляецца матор з газонапрыбіральнай машыны.

21 САКАВІКА 1987 года студэнт вышэйшай музычнай навучальнай установы Хрысціян Патцыг, уладкаваўшыся на сваім веласіпедзе задам наперад, праехаў за пяць гадзін 8 мінут адлегласць у 60,45 км. Дваццацічатырохгадовы аматар музыкі іграў увесь гэты час на скрыпцы. Месца дзеяння: участак аўтастрады, што вядзе да горада Санкт-Гален (Швейцарыя).

АЎТАГОЛ

## СТЫМУЛ — ЗДАРОЎЕ

Дзяўчына нясмела адчыніла дзверы і праціснулася ў пакой. Прывітаўшыся, так і засталася стаяць пасярод кабінета, пераминаючыся з нагі на ногу. Выраз твару яе выклікаў спагаду. Убачыўшы свайго выкладчыка, дзяўчына нерашуча падышла да стала.

— Ну, што, ролі памяняліся — зараз вы прыходзіце нас прасіць? Але ж аб чым можа ісці размова: у вас больш за дваццаць гадзін пропускаў. Вы думаеце іх адпрацоўваць?

Так, яна думала. Толькі думала. А між тым экзаменацыйная сесія, як кажуць, была на носе. Без заліку ж па фізкультуры, па палажэнню, студэнт не дапускаецца да здачы экзаменаў. У гэтым мяне пераконвалі ў дэканатах. Тым не менш, калі прасіла назваць канкрэтныя выпадкі, у адказ пацiскалі плячыма: маўляў, не памятаем дакладна. І толькі адзін дэкан аказаўся больш шчырым, заявіўшы: «Усе атрымаюць залік па фізкультуры».

Што гэта: упэўненасць у тым, што студэнты адпрацуюць патрэбную колькасць гадзін, ці ў тым, што выкладчыкі калі-небудзь усё ж не вытрымаюць іх атак і «здадуцца»?

— Няправільна думаюць тыя, хто ўпэўнены, што адзнака па фізкультуры (як, прынамсі, і па іншых прадметах) патрэбна выкладчыку,— лічыць старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту У. С. Мурашоў.— Гэтак жа, як і здароўе студэнтаў: яно неабходна ў першую чаргу ім. Так, выкладчыкі ідуць часам на ўступкі, бо перакана" ны: таго, хто ігнаруе спорт, ніколі не прымусіш ім займацца.

Хтосьці са знаёмых студэнтаў горача пераконваў, што не ходзіць на заняткі па фізкультуры таму, што яны не цікавыя. Вельмі аргументаваны довад. Аднак колькі ні ламала галаву, так і не змагла прыдумаць, чым іх зацікавіць? Размінка, здача норм комплексу ГПА, якія абавязкова патрэбна выканаць... Здаецца, школьная гульня ў хованкі тут будзе не зусім да месца.

Кажуць, няма стымула. Калі ім не з'яўляецца ўласнае здароўе (нешта сумняваюся, што хто-небудзь займаецца спортам самастойна), то ўсё ж тое, што такога студэнта не дапусцяць да здачы экзаменаў, павінна прымусіць яго задумацца. Трэба толькі кіраўніцтву факультэта быць больш прынцыповым. Не лічыць фізкультуру прадметам другарадным і непатрэбным. Інакш навошта ён наогул у раскладзе заняткаў?

НЯЎЖО?!

## КАРАТЭ + БОКС = ...

Даволі сціплая рэклама паведамляла і запрашала: «Кікбоксінг — у Мінску! Усесаюзныя спаборніцтвы». Той, хто не паленаваўся і прыехаў у Палац лёгкай атлетыкі СКА ЧБВА, стаў сведкам нязвыклага для нас пакуль яшчэ відовішча. Што такое кікбоксінг? Гэта від адзінаборства, які сінтэзуе элементы каратэ і бокса, удары наносяцца рукамі і нагамі, асобныя часткі цела спартсмена ахоўваюцца.

Падведзены вынікі. З васьмі першых месцаў пяць — за мінскімі спартсменамі. Беларускі кікбоксінг мацнейшы ў краіне!

Фота С. ГРЫЦА.





БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
18 студзеня
Зак. 2000.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.